Пралетары ўсіх краін, злучайцеся!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 248 (1215) СУБОТА, 25-га кастрычніка 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сакратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.
Кошт асобнага №—2 кап.

ТЭЛЕГРАМА

Усім райкомам ЛКСМБ

АСЬВЯТЛЯЙЦЕ РАБОТУ РАЁННЫХ КОНФЭРЭНЦЫЙ ЛКСМБ У „ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНЕ“

Сакратар ЦК ЛКСМБ ПАЛЯКОЎ
Рэдактар газэты „ЧЗ“ САМУЦІН

ДА РАЁННЫХ КОНФЭРЭНЦЫЙ ЛКСМБ

ДА СУРОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ ТЫХ, ХТО ІГНАРУЕ РАБОТУ З БЕДНАТОЙ

...жнейшы вучастак—масавая работа ЛКСМБ з батрацкай і бядняцкай моладзьдзю—знаходзіцца ў заняпадзе. Па шэрагу райорганізацый ЛКСМБ конкрэтная справа падмяняецца опортуністычнай бязьдзейнасьцю, славеснай шуміхай, мітынгоўшчынай

...рэба памятаць, што—„недаацэнка работы з батрацтвам і беднатой зьяўляецца найшкаднейшай праявай правага опортунізму на практыцы“

...аша задача:—накіраваць руйнуючы агонь па опортунізму, разгарнуць работу з беднатой, падначаліўшы яе асноўнаму—уцягненьню бедноты ў колгаснае будаўніцтва, ліквідацыю кулацтва як клясы, на базе суцэльнай колектывізацыі

ОПОРТУНІСТЫМ, ДВУРУШНІКАМ НЯ МЕСЦА У КОМСАМОЛЕ

16-ты зьезд УсеКП(б) у адносінах да правых опуртуністых вы... рашэньне, якім рашуча асуджае шкодную сутнасьць правага ўхілу ў ...ртыі і з асаблівай вастратой падкрэсьлівае несумяшчальнасьць по...даў, дзеяньняў, а тым больш фракцыйнай работы правага опор...нізму, з прабываньнем у шэрагах комуністычнае партыі.

„Альбо, альбо“—вось як партыя паставіла пытаньне перад лідэрамі ...авага опортунізму і ўсімі тымі, хто на словах і на справе адбівае погляды.

Рашэньні XVI Зьезду УсеКП(б) цалкам і поўнасьцю адносяцца і да ...М організацыі.

Правым опортуністым, — гэтай агэнтуры клясавага ворага, кулака ...ошмана ў шэрагах партыі і комсамолу, якая зрывае справу соцы...істычнага будаўніцтва нашай краіны,—ня можа быць месца ў орга...ацыі ЛКСМБ.

Адгэтуль зусім відавочна, што ўся практычная дзейнасьць комса...льскай організацыі павінна быць прасякнута самай бязьлітаснай ...рацьбой з правым ухілам, бяззубым, мотошным шчабятаньнем ухі...стых аб „немагчымых тэмпах... об'ектыўных прычынах“... і г. д.

Толькі пры гэтых умовах мы забясьпечым выкананьне ўзятых ...ртыяй і рабочаю клясай тэмпаў, забясьпечым посьпехі соцыялістыч...га будаўніцтва.

Аднак, шэраг матар'ялаў, якія паступаюць з месц і асабліва абу...ючыя факты, зьмешчаныя ў апошніх нумарох „Чырвонай Зьмены“, ...усёй бясспрэчнасьцю сьведчаць аб тым, што па шэрагу раёнаў ком...ольская організацыя, як належыць, яшчэ ня ўзброілася на барацьбу ...равым опортунізмам, не мобілізавала вакол яго сутнасьці грамадз...е думкі шырокіх мас рабочай і працоўнай моладзі.

Як інакш расцэньваць апошнюю вылазку правых опортуністых ...Магілеўскім політасьветным тэхнікуме, „устаноўчкі“—гэтай вы...кі?

Як інакш расцэньваць шэраг абураючых фактаў, калі комса...льцы, бяёкуючыся з кулаком, вядуць разлагаючую дзейнасьць у кол...се? (Полацак).

Як інакш расцэньваць моманты злачыннай непаваротнасьці, сан...асьці ў справе рэалізацыі хлебазагатоўчых плянаў, жывёлагадоў...й проблемы, ліквідацыі бульбянага прарыву і шэрагу іншых мера...ыемстваў?

Урэшце—як інакш расцэньваць зьмяшчаемы ў сёньнешнім ну...ры газеты матар'ял аб недапушчальна слабой рабоце па організа...і батрацкіх і бядняцкіх мас вёскі, па організацыі шыркага пры...ягненьня іх да непасрэднага актыўнага ўдзелу ў соцыялістычнай ...абудове сельскай гаспадаркі? Гэта работа ва многіх выпадках зусім ...вядзецца.

Такі стан работы з батрацтвам і беднатою кладзе свой адмоўны ...адбітак на становішча практычнай дзейнасьці організацыі.

Жыцьцё паказала, што там, дзе добра працуюць групы і сходы ...беднаты, там добра падрыхтаваны сустрэчны прыліў у колгасы, там ...колгаснае будаўніцтва набывае магутны размах, ахапляе ўсё новыя ...новыя батрацкія, бядняцка-серадняцкія масы вёскі. Недаацэнку ра...боты з батрацтвам і беднатой партыя рашуча ацаніла як праяву ...самага шкоднага выгляду правага опортунізму на практыцы, патрабу...ючы бязьлітаснай з ім барацьбы.

А як на справе?

На справе—шэраг КСМ організацый забывае гэта, і работа з бат...рацтвам, беднатой, асабліва з моладзьдзю гэтых соцыяльных пра...слоек, у лепшым выпадку зводзіцца да нікчэмнай славеснай шуміхі, ...мітынгоўшчыны.

Прыведзенныя факты не адзінкавы, яны красамоўна гавораць аб ...ненармальных, няхайных адносінах шэрагу організацый да важнейшай ...справы—барацьбы за генэральную лінію партыі на асноўных ву...частках соцыялістычнага будаўніцтва, мабілізацыі на гэту справу іні...цыятывы і энтузіязму шырокіх рабочых і працоўных мас.

Небясьпечнасьць такога становішча ўскладняецца яшчэ і тым, ...што гэтыя праявы правага опортунізму ня ўсюды сустракаюць руй...нуючы адпор з боку як кіраўніцтва, так і самой КСМ організацыі.

Безумоўна, было-б зусім несправядліва аднесьці прыведзеныя вы...шэй факты да ўсёй організацыі. КСМ організацыя ў сваёй асноўнай ...масе на практыцы паказала сапраўды бальшавіцкія прыклады барацьбы з ...правым опортунізмам на ўсіх франтох соцыялістычнага будаўніцтва. ...Аднак, гэта зусім не значыць, што сёньня мы не павінны сыгналізаваць прад організацыяй наяўнасьць небяспекі, не павінны мобілізаваць організацыю на бязьлітасную барацьбу з гэтай небясьпекай.

Сёньня пачынаюцца раённыя комсамольскія конфэрэнцыі. Уся работа конфэрэнцый павінна прайсьці пад знакам самай бязьлітаснай, непрымірымай барацьбы з правым опортунізмам, як з тэорыяй, так і ў асаблівасьці з практыкай яго, не паслабляючы, у сваю чаргу, барацьбы з „левымі“ загібамі.

РайКСМ конфэрэнцыі, зьяўляючыся аднačасова трыбунай абагульненьня масавага вопыту саюзнай работы, генэральнай праверкай становішча і практычнай дзейнасьці організацыі, магутным вагаром яе палепшаньня,—павінны раскрыць твар сёньнешняга комсамольца-опортуністага, выкрыць усе формы правага опортунізму ў КСМ, у якім-бы выглядзе яны ні выяўляліся. Разьбіць ушчэнт магчымыя на конфэрэнцыях права-опортуністычныя вылазкі, двурушніцкую манэўранасьць. Інакш ня можа быць.

Інакш уся работа конфэрэнцый ня будзе варта ломанага граша і атрымае больш адмоўныя, чым станоўчыя вынікі.

Руйнуючы агонь па правым опортунізьме, у якім-бы выглядзе ён ні праяўляўся.

За ўдарныя тэмпы соцыялістычнага будаўніцтва, за генэральную лінію партыі,—вось сьцяг райКСМ конфэрэнцый.

З гэтым сьцягам комсамол Беларусі яшчэ больш шчытнаю калёнай падыйдзе да свайго дзесятага зьезду і IX-га зьезду УсеЛКСМ.

Растуць новыя колгасы

ЧЭРВЕНЬ, 24. (Па тэлефону ад нашага юнкора). За апошні час, у сувязі з прапрацоўкай рашэньняў XVI зьезду ЎсеКП(б), а таксама і адозвы ЦК ад 3-га верасьня, у паасобных сельсаветах Чэрвеньскага раёну наглядаецца вялікі зрух бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у напрамку колгаснага будаўніцтва.

Па ўсім раёне організавана за час уборачнай і асеньняй кампаніі **9 новых колгасаў, 2 саўгасы і 5 ініцыятыўных груп.**

У старыя колгасы ўступілі 63 аднаасобныя гаспадаркі.

У вёсцы Матусава-Галава (Хутарскі сельсавет) організаваны колгас „Ленінскі шлях“, у які ўвайшла ўся вёска цалкам.

У вёсцы Малая Галута організаваны колгас „Партызан“, у які ўвайшлі 32 гаспадаркі.

У вёсцы Падасінавічы і Юравічы па ініцыятыве груп беднаты організаваны ініцыятыўныя групы.

У Горкаўскім сельсавеце організаваны тры новыя колгасы: „Горкі“, „Энгельс“ і „Энэргія“.

У вёсцы Кабзовічы організавана ініцыятыўная група. У Ладнанскім сельсавеце організаваны саўгас „Маладая Гвардыя“ на плошчы 1000 га. У Дамавіцкім сельсавеце організаваны саўгас „Будзёны“ на плошчы 1114 га.

РАКІТА.

Вынік бальшавіцкай работы

Дзякуючы добра пастаўленай працы з групай беднаты вёскі Пуцілкавічы, М.—Далецкага сельсавету Вушацкага раёну, гэтымі днямі ОРГАНІЗАВАЎСЯ КОЛГАС, ПАД НАЗВАЙ „13-ТЫ КАСТРЫЧНІК“. Зараз-жа на сходзе абралі праўленьне, у якое ўвайшла беднота. У організацыі колгасу АКТЫЎНЫ ЎДЗЕЛ ПРЫНЯЛІ ЖАНЧЫНЫ.

ГРЫДЗЮШКА.

Ніякай работы з батрацтвам і беднатой не праводзіцца

Праца з батрацтвам і беднатой Камаровіцкага сельсавету, Петрыкаўскага раёну, пастаўлена з рук вон дрэнна.

Комсамольская ячэйка ні разу ня ставіла пытаньня аб уцягненьні батракоў у шэрагі КСМ, не праводзіцца ніякай работы сярод рабочых саўгасаў. Калі адзін рабочы падаў заяву аб прыёме ў комсамол, дык сакратар ячэйкі схаваў яе і да гэтага часу заява не разгледжана.

Партыйная ячэйка таксама не вядзе ніякай працы з групамі беднаты.

А. РЭЗКІ.

Групы беднаты існуюць... на паперы

Праца з беднатой Дрычанскага сельсавету, Пухавіцкага раёну, не вядзецца. Пры сельсавеце ня існуе групы беднаты.

А па вёсках групы існуюць толькі на паперы.

Палітычныя кампаніі, хлеба і бульбазагатоўкі, самаабкладаньне і інш. не абгаварваюцца на сходах беднаты, а **таму і гэтыя кампаніі па сельсавеце праваліваюцца.** Партыйная і комсамольская ячэйкі стаяць ў баку ад кіраўніцтва бядняцкімі групамі.

МІФА.

Тварам да... паветра

У Туранскім сельсавеце Пухавіцкага раёну ніякай працы не вядзецца з беднатой і батрацтвам. Батрацкая моладзь ня ўцягнута ў ячэйку ЛКСМБ. Ячэйка не праводзіць ніякай работы сярод колгаснай моладзі колгасу „Беларуская Вёска“. Ячэйка ніколі не абгаварвала на сходах батрацка-бядняцкай моладзі гаспадарча-палітычных пытаньняў, якія праводзяцца партыяй і комсамолам на вёсцы. Шэраг комсамольцаў Туранскай ячэйкі зусім здарваўся ад комсамолу (Карнейчык і інш.).

Пухавіцкі РК ЛКСМБ яшчэ ўлетку браўся організаваць у колгасе „Беларуская Вёска“ комсамольскую ячэйку, але справу не давёў да канца і комсамольцы колгасу механічна выбылі з ячэйкі

ХВАЁВЫ.

Групы беднаты без кіраўніцтва

Па Навасёлкаўскім сельсавеце Пухавіцкага раёну пры ўсіх колгасах, таксама і пры сельсавеце, складзены групы беднаты. Але гэтыя групы нічога ня робяць з-за адсутнасьці кіраўніцтва партыйных і комсамольскіх ячэек. Беднота слаба ўдзельнічае ў праводзеньні гаспадарча-палітычных кампаній.

МАЛЯЎКА.

Працу з беднатой опортуністы Сіцкі ігнорує

У Раваніцкім сельсавеце (Чэрвеньшчына) праца з беднатой не вядзецца. Організаваныя пры сельсавеце і колгасах групы беднаты не працуюць. Раваніцкая партыйная ячэйка ў галіне працы з беднатой бязьдзейнічае

Пастановы 16 зьезду ЎсеКП(б) і XIII зьезду КП(б)Б на сходах беднаты і батрацтва не абгаварваліся.

Комсамольская, а таксама і партыйная ячэйкі не звараочваюць увагі на тое, каб замацаваць таварыскія адносіны беднаты і серадняцтва, якія яшчэ знаходзяцца па-за колгасам.

Сходы беднаты сумесна з колгасьнікамі не праводзяцца. На сходы колгасьнікаў вясковая беднота не запрашаецца.

Сакратар партыйнай ячэйкі, тав. Сіцкі, зусім ня цікавіцца працай з беднатой. Свае адносіны да працы т. Сіцкі тлумачыць: „мяне ўсё роўна зьнімуць з працы“.

Чэрвеньскі РК павінен як найхутчэй прыцягнуць да суровай адказнасьці махровага опортуністага-сакратара партыйнай ячэйкі Раваніцкага сельсавету.

Сымон Цікі.

„У КРАІНЕ НЯПІСЬМЕННАЙ ПАБУДАВАЦЬ КОМУНІСТЫЧНУЮ ГРАМАДУ НЕЛЬГА“ (ЛЕНІН)

У БОЙ ЗА ГРАМАТУ!

Дзесяткі тысяч працоўных яшчэ не ахоплены школамі лікбезу. Некаторыя раённыя комсамольскія організацыі ў баку ад гэтай барацьбы

Змагайцеся за ўсеагульную ліквідацыю няпісьменнасьці

Справу давесьці да канца

Падрыхтоўчая праца да правядзеньня ліквідацыі няпісьменнасьці па Лёзьненскім раёне разгарнулася ва ўсю шырыню.

Праведзен пагалоўны вучот няпісьменных па ўсім раёне. Пры сельсаветах працуюць камісіі садзейнічаньня па ліквідацыі няпісьменнасьці, і ўсеагульнаму абавязковаму навучаньню.

Усяго па раёне будзе працаваць 123 лікпунктаў.

РК ЛКСМБ вылучыў 60 ліквідатараў няпісьменнасьці. 25 старэйшых піонэраў і школьнікаў таксама будуць працаваць ліквідатарамі.

Праведзены двухтыднёвыя курсы ліквідатараў няпісьменнасьці, якія выпусьцілі 30 асоб колгасьнікаў.

Зараз асноўным недахопам у падрыхтоўцы да адчыненьня лікпунктаў зьяўляецца адсутнасьць памяшканьняў і адпаведнага абсталяваньня. Шэраг памяшканьняў, намечаных для заняткаў лікпунктаў да працы зусім не прыстасаваны.

Неабходна мобілізаваць усю грамадзкасьць, каб знайсьці для лікпунктаў у самы кароткі тэрмін адпаведныя памяшканьні з належным абсталяваньнем.

Комсамольскія ячэйкі на мясцох павінны тэрмінова заняцца гэтым важнейшым пытаньнем, каб справу ліквідацыі няпісьменнасьці давесьці да канца.

Кароль.

Прыгожыя рэзолюцыі пад сукном

У Вульскім раёне налічваецца звыш 4500 чалавек няпісьменных. Маркуецца адчыніць 170 лікпунктаў і 14 школ малапісьменных. Бюро райкому КСМ вынесла па гэтай справе прыгожую рэзолюцыю, якая пакладзена пад сукно. Комсамольская організацыя раёну не мобілізавана на правядзеньне ліквідацыі няпісьменнасьці, профсаюзы—далёка ў баку.

У большасьці сельсаветаў не падабраны памяшканьні. Няма падручнікаў, апалу і асьвятленьня.

Калі савецкія ўстановы, комсамол і профсаюзы не мобілізуюць адпаведнай увагі організацыі—справа з ліквідацыяй няпісьменнасьці стане пад пагрозай зрыву.

Мы патрабуем прыняцьця рашучых захадаў.

Комсамолец.

Важная справа правальваецца

Кобыльская і Расткоўская ячэйкі ЛКСМБ (Лядняскага р-ну) нічога не зрабілі для ліквідацыі няпісьменнасьці.

Невядомы нават лік няпісьменных у гэтых сельсаветах. Зусім дрэнна справа з памяшканьнем для лікпунктаў.

У м. Лядах скончылі працу двухтыднёвыя ліквідатарскія курсы. Выпушчана 15 ліквідатараў, але і яны да працы не прыступілі.

Комсамольцы нічога не зрабілі, каб належным чынам падрыхтавацца да навучальнага году. Асабліва адстае Кобыльская ячэйка. Сакратар—Панкавец Марк і член бюро Шыцікаў нічога ня робяць у гэтым напрамку.

Пры такім становішчы ліквідацыя няпісьменнасьці ў раёне можа сарвацца.

Роша Нябылаў.

2400 чалавек па-за лікпунктамі

У Стара-Дарожскім раёне райштаб па ліквіпісьменнасьці не працуе, а ў сваю чаргу не працуюць штабы і пры сельсаветах.

Партыйна-комсамольскія ячэйкі і сельсаветы яшчэ не раскачаліся, і ня кіруюць гэтай справай. Райінспэктура Нарасьветы працуе самастойна і ня здолела мобілізаваць масу на ліквідацыю няпісьменнасьці. У раёне будзе застаўлена па-за лікпунктамі 2400 няпісьменных, якіх па думцы інспэктуры нельга ахапіць, бо не хапае ліквідатарскіх сіл.

Праца лікпунктаў павінна была распачацца 15-га кастрычніка, але з-за непадрыхтаванасьці і да гэтага часу не пачата.

Лікпункты — без падручнікаў. Наркомасьветы да гэтага часу падручнікаў ня прыслаў.

Неабходна зараз-жа мобілізаваць усю ўвагу грамадзкасьці, прыцягнуць да адказнасьці шкоднікаў у справе ліквідацыі няпісьменнасьці. Патрэбна, каб райштаб выехаў на месцы для дапамогі ў організацыі лікпунктаў. Трэба мобілізаваць усе пісьменныя сілы, каб 2400 не засталіся па-за лікпунктамі.

М.

Ліквідацыя няпісьменнасьці зрываецца

Ліквідацыі няпісьменнасьці ў Плешчаніцкім раёне, дзякуючы дрэнным адносінам комсамольскіх ячэек, пагражае зрыў.

З 1 па 8 верасьня былі праведзены курсы ліквідатараў. Курсанты павінны былі да 1 кастрычніка пачаць працу, але і зараз амаль ні адзін лікпункт не працуе.

Праведзена зусім нязначная растлумачальная праца аб усеагульным абавязковым навучаньні. З раёнаў, з-за адсутнасьці працы, няма ніякіх аквестак.

Такое становішча далей нецярпіма. РК ЛКСМБ павінен мобілізаваць комсамольцаў для ліквідацыі няпісьменнасьці.

Гурэвіч.

Як на паляваньне ісьці...

У Гомелі 2.600 няпісьменных і 2 з пал. тысячы малапісьменных. Аднак, да навучальнага году адпаведныя організацыі не падрыхтаваліся. Культштаб толькі зараз думае дамаўляцца з установамі аб памяшканьнях.

Профсаюзы ніякага ўдзелу ў падрыхтоўцы да ліквідацыі няпісьменнасьці ня прымалі, нават у саюзе чыгуначнікаў праганяюць ліквідатараў і організатараў.

Неабходна зараз-жа дабіцца значнага пералому ў працы, бо навучальны год у Гомелі можа сарвацца.

Ярмак.

БЕЛАРУСЫ НА ДОНБА

НА ШТУРМ ВУГАЛЬНАГА ПРАРЫ

Ленінскі комсамол Беларусі паслаў частку сваіх комсамольцаў на ліквідацыю вуга[льнага] прарыву. Некаторыя гора-комсамольцы здрадніцкі пакінулі гэты фронт

Да ганебнага слупу дэзэртыраў з гаспадарчага Перакопу

Здрадніцкі пакінулі фронт

... До коммуны перегон
Не покрыть на этой кляче...
(Маякоўскі)

Магутнае, чорнае сэрца краіны пачало даваць перабоі. Трывожнымі сыгналамі гарэлі калёнкі лічбаў. Лічбы паказвалі зьніжэньне. Магутнае сэрца не давала патрэбнай колькасьці крыві і гэта пачало адчувацца на заводах, фабрыках, домнах...

Трывогаю гудзелі гудкі.

У гэты дзень рэзалі слова—прарыў. Тут прарыў не на фронце грамадзянскай вайны, а фронце гаспадарчага перакопу, прарыў плянаў нашага будаўніцтва на вугальным вучастку фронту. І таму, як тады—10 год раней, комсамол абвясьціў мобілізацыю на Донбас.

Донбас—фронт.

Бадзёра сустрэў комсамол мобілізацыю. Не ўпяршыню яму ісьці змагацца і ў першых шэрагах перамагаць. Чырвонай істужкай пяўз усю яго гісторыю праходзіць шлях барацьбы на франтох грамадзянскай вайны, на фронце аднаўленьня краіны, барацьбы за прамфінплян і культурнае будаўніцтва.

І на гэты фронт—ліквідацыю прарыву—былі кінуты сілы комсамолу.

Па гарадох і вёсках кіпела праца. Мобілізацыйная гарачка ахапіла ўсе колектывы, усіх комсамольцаў—шла баявая праца.

Комсамолія пасылала на Донбас свае сілы, мобілізацыя на Донбас зьявілася лепшай праверкай якаснага складу комсамольскай організацыі, паказала, наколькі паасобныя комсамольцы сапраўды адданы справе і здольныя пайсьці па загаду партыі на патрэбны фронт.

Гэта праверка выявіла шмат чаго. Высьветліла твар комсамольцаў, якія не апраўдваюць гэтага званьня і ганебна, здрадніцкі ўцякаюць з гаспадарчага фронту.

Цягнікі адышлі...

Шмат комсамольцаў пакінула Донбас. Яны паехалі туды, каб разам з лятунамі, творцамі прарываў і на нашых прадпрыемствах пакінуць шахты.

Пастановы комсамольскіх організацый многіх куткоў Беларусі поўны вялікім абурэньнем, зьнявагай да тых, хто пакінуў Донбас.

Бюро Чырвона-Слабодзкага РК КСМ у сваёй пастанове ад 15-га кастрычніка аб дэзэртырах з Донбасу піша:

„2. Бюро лічыць несумяшчальным прабываньне ў шэрагах комсамолу дэзэртыраў з адказьнейшага фронту соцыялістычнага будаўніцтва.

Уцякачоў выключыць з шэрагаў КСМ, абвясьціўшы ім байкот усёй грамадзкасьцю.

3. Паставіць пытаньне перад профсаюзамі і праўленьнямі колгасаў аб выключэньні іх з сяброў саюзаў і колгасаў, як дэзэртыраў з працоўнага фронту, недапушчаючы іх на працу ва ўстановы і колгасы“.

Гэтая пастанова вынесеная ў адносінах уцёкшых з Донбасу комсамольцаў—Матуховіча, Коўзуса, Лобаня, Статкевіча, Максіменкі, Макушэва—зьяўляецца клясавым прысудам тым, хто ня можа апраўдаць званьне комсамольца.

Такія скурнікі знайшліся і ў іншых організацыях. Бюро Аршанскага РК КСМ выключыла з комсамолу Палуяна, Пагуляка, Яўгушэнку і іншых. Яны выкінуты з шэрагаў комсамолу.

З Тураўскай організацыі выключаны Янковіч і Асоўскі.

Разам з гэтымі фактамі скурніцтва выяўляюцца прыклады сапраўднай комсамольскай самаадданасьці і вытрыманасьці.

У Віцебску на станцыі стаялі падрыхтаваныя к адходу вагоны. Застаўся адзін дзень. Комсамольцы скурзаводу, Урыну і Стукэльскі, мобілізаваныя ў Донбас, адмаўляюцца ехаць. Тады комсамольцы Нямізанскі і Гузман добраахвотна бяруцца ехаць і бадзёра пакідаюць Віцебск.

Такіх прыкладаў шмат. У большасьці мобілізаваныя на Донбас комсамольцы засталіся там і вядуць упартую барацьбу з прарывам.

Але доўг комсамолам яшчэ не аплачаны.

Прарыў на Донбасе не ліквідаваны. Пакінуўшыя гэты адказьнейшы вучастак, комсамольцы павінны быць кінуты з шэрагаў комсамолу, як зрабілі некаторыя організацыі.

Мізэрныя людзішкі, здрадзіўшыя пролетарыяту і паставіўшыя асабістыя інтарэсы вышэй інтарэсаў рабочае клясы, сапраўды заслужылі той грамадзкі байкот і зьнявагу, якімі наша пролетарская грамадзкасьць абрушаецца на дэзэртыраў з гаспадарчага Перакопу.

Прарыў павінен быць ліквідаваны. Неабходна напружыць усе сілы, ... канаць нам... разьвёрстку, ... Донбасу патрэбную колькасьць працаўнікоў.

На шырокіх сходах рабочых ... лзі неабходна абгаварыць пытаньне, організаваць паказальныя суды над дэзэртырамі з фронту будаўніцтва соцыялізму.

Л. Гл...

Змагаром за соцыялізм—т. т. Каралькову, Гу...раву, Пелешаву, Коласаву

Пасылаючы вас на Донбас, у выкананьне асноўнай дырэктывы нашага ленінскага ЦК, мы былі ўпэўнены, што вы разьбіце ўсе ілюзіі і хлусьню ворагаў нашага соцыялістычнага будаўніцтва і сваёй непасрэднай работай у шахце дасьцё магчымасьць пашыраць і будаваць новыя соцыялістычныя фабрыкі, заводы, каб на гэтым грунце яшчэ больш рашуча наступаць на ўсім фронце.

Комсамол здолеў давесьці, што ён зьяўляецца сапраўдным дапаможнікам партыі ў вырашэньні ўсіх, зьвязаных з нашым ростам цяжкасьцяй. Пасылаючы вас у Донбас, мы далі сваё ... нінскае слова ліквідаваць усе прарывы, якія мы маем ва ... рачна-пасеўнай кампаніі, стаць на чале кіраўніцтва новай ... ляй колектывізацыі.

Мы маем вялікія дасягненьні па перавыкананьню прамфінпляну на адным з буйнейшых прадпрыемстваў нашага раёну. Добруская ф-ка атрымала ордэн Чырвонага Сьцягу. І гэта дасягнута дзякуючы правільнаму партыйнаму кіраўніцтву і ...ганьню ўсёй комсамольскай організацыі сумесна з рабочым колектывам за прамфінплян.

І назву чырвонаштандарцаў наша організацыя будзе несьці горда наперад, да канчатковай перамогі соцыялізму.

Так змагайцеся ў шахтах за кожны грам вугалю, каб ... мам нашых качагарак зьнішчыць капіталістычны элемэнт і будаваць соцыялізм у нашай краіне.

Па даручэньню бюро РК ЛКСМБ—сакратар **КАМІСАРЧЫК.**

З цэнтру Украінскай Савецкай Соцыялістычнай рэспублікі--Харкаву--РК ЛКСМБ

Шлём свае комсамольскае прывітаньне. Мы зараз знаходзімся ў Харкаве і чакаем свайго цягніка. Усюды нас добра прымаюць. Настрой бадзёры. Аб 11-ай гадзіне ўночы мы адпраўляемся на Донбас.

Пакідаючы Беларусь, мы абяцаем комсамолу, які накіраваў нас на ліквідацыю прарыву, што задачы, якія ўсклаў ён на нас, выканаем з гонарам. Цьвёрда і рашуча будзем змагацца за перавыкананьне прамфінпляну, за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады. Комсамол ня могуць стрымаць цяжкасьці і перашкоды. Комсамол зьмяце на сваім шляху ўсё тое, што рашкаджае.

Мы заяўляем, што зьяўляемся сапраўды комсамольцамі—лепшымі змагарамі за пабудову соцыялізму.

Кожны новы завод, кожны організаваны колгас—гэта ўдары молата па вечку труны ліквідуемага ў нашай краіне капіталізму.

Няхай жыве Донбас—кочагарка нашай краіны.

Няхай жыве пабудова соцыялізму ў нашай краіне.

Група комсамольцаў: ...мейка, Садоўскі, ...лёў Е. і Нараўкоў.

СТАНЦЫЯ БАХМАЧ, 12 гадзіна ночы. Наш цягнік ціць уперад—у Донбасе астаноўка. Донбас будзе нашай радзімай, так гаварылі мы яшчэ ў вагоне.

Мы, загартаваныя ленінскія барацьбіты, з вясёлай бадзёрасьцю едзем добраахвотна ў шахты Донбасу.

Няхай жыве ЦК УсеКП(б), які сказаў: да 1 студзеня ... мільёнаў тон вугалю і ні грама менш.

Чакайце далей...

Вашы комсамольцы:

КАРАЛЬКОЎ, ГАНЧАРОЎ, ЦЕЛЬСЬЦЕЎ, ВОЛАСАЎ.

20 кастрычніка, а 4 гадзіне дня, з Масквы адпраўлен першы скразны комсамольскі эшалён з прамтаварамі і спэцвопраткай для рабочых Донбасу. Эшалён суправаджае комсамольская брыгада.

На здымку: пагрузка тавараў для рабочых Донбасу.

Ганьба дэзэртырам

Тураўскаму райкому комсамолу дадзена заданьне:—мобілізаваць у Донбас 200 чалавек. Райком выканаў заданьне ўсяго на 80 проц. Гэтымі днямі на паседжаньні бюро ЛКСМБ ганьбілі комсамольцаў, якія адмовіліся ехаць у Донбас. РК выключыў з комсамолу **Янковіча і Асоўскага**, якія пакінулі гэты фронт.

Ганьба дэзэртырам!

Юнкор Навальніца.

Букет дэзэртыр...

Плешчаніцы, 24. (Па ...) — З Плешчаніцкай ор[ганізацыі] ЛКСМБ былі накіраваны 14 чалавек. 12 з гэтага ... заліся дэзэртырамі. Вось ... вішчы: **Акуліч Янка, Яўген, Патрашка, Пустаход, Бардушка,** і іншыя комсамольцы, якія ... шчаніцы не зьвярнуліся.

Патрабуем выключэньня дэзэртыраў з шэрагаў ЛК...

САМАКРЫТЫКА—МАГУТНАЯ ЗБРОЯ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА

Райкомы, ячэйкі ЛКСМБ яшчэ не разгарнулі работы вакол правядзеньня ўсебеларускага рэйду, праверкі дзейснасьці самакрытыкі ў друку

Па шэрагу месц рабкоры, селькоры, юнкоры ня прыцягнуты да актыўнага ўдзелу ў выкананьні гэтага важнага мерапрыемства. Райштабы і групы „Лёгкай Кавалерыі“ бязьдзейнічаюць

Патрабуем неадкладна гэта выправіць—уключыцца ў рэйд, накіраваць вастрыё „кавалерыскіх пік“ на барацьбу з правым опортунізмам, бюрократызмам і цяганінай, якія перашкаджаюць нашаму будаўніцтву

ЗМАГАЦЦА ЗА ДЗЕЙСНАСЬЦЬ БАЛЬШАВІЦКАЙ САМАКРЫТЫКІ

Усім вядома, што „толькі разгортваючы шырокую хвалю самакрытыкі, узьнімаючы ярасьць мас на барацьбу са шкодніцтвам, бюрократызмам, безгаспадарнасьцю, рашуча змагаючыся з адхіленьнем ад генэральнай лініі партыі, у першую чаргу з правым ухілам і прымірэнцтвам да яго,—мы забясьпечваем палепшаньне працы нашага апарату, магчымасьць пасьпяховага выкананьня намечаных плянаў соцыялістычнага будаўніцтва“ („Ч. З.“).

Самакрытыка зьяўляецца галоўнейшай зброяй у выкрыцьці ўсіх недахопаў, і таму крытыка ў друку, праца „ЛК“, ажыцьцяўленьне сапраўды масавага кантролю мае вялізарнае значэньне.

Рэагаваньне на зьмешчаныя ў друку матар'ялы зьяўляецца першачарговай задачай адпаведных організацый.

Але, нажаль, пакуль мы гэтага яшчэ ня маем.

Напрыклад, 13 кастрычніка пісалася аб тым, што з 1-га студзеня да гэтага часу рэдакцыя паслала на расьсьледваньне 951 заметку, з якіх на 682 заметкі мы і па сёньняшні дзень не атрымалі адказу.

Кастрычнікаўскі РК ЛКСМБ не адказаў на 6 допісаў, Фрунзэўскі—на 8, Самахвалаўскі—на 3, Стара-Дарожскі—на 3, Заслаўскі—на 5 і г. д.

Усебеларускі рабселькораўскі рэйд за дзейснасьць рабселькораўскіх заметак, аб'яўлены ЦБК НК РСІ і рэд. „Зьвязда“, у які ўключылася „Ч. З.“, не атрымаў належнага размаху.

Шэраг організацый і дагэтуль не рэагуе на нашы допісы.

Рэдакцыя, уключаючыся ў рэйд, зьвярнулася з заклікам да ўсіх комсамольцаў, юнкораў і „лёгкіх кавалерыстых“ уключыцца ў рэйд і дасылаць матар'ялы ў рэдакцыю. Мы яшчэ нічога не атрымалі ад нашых юнкораў і „Л. К.“, ня гледзячы на тое, што на мясцох вельмі часта сустракаюцца факты ігнараваньня крытыкі друку і працы „Л. К.“.

Друкуемы сёньня матар'ял сьведчыць аб тым, што ў некаторых організацыях, дзе заселі опортуністыя, крытыка не ў пашане, яе ня любяць.

Лагойскія „абкладацелі“ абшарылі ўвесь раён і знашлі толькі 1-го кулака.

У Парыцкім р-не, замест дапамогі, перашкаджаюць у працы масаваму пролетарскаму кантролю—„Л. К.“.

Старшыня РВК—Дашко, замест рэагаваць на выяўлены недахопы „ЛК“, гоніць „кавалерыстых“ з габінэту.

У Прапойскім р-не таксама дрэнна рэагуюць на матар'ялы, выяўленыя „ЛК“. З вышэйпададанага мы бачым, што „дзейснасьці самакрытыкі ў друку перашкаджае яшчэ і да гэтага часу бюрократычнае супрацоўленьне „апаратчыкаў“ і няўважлівыя адносіны да запатрабаваньняў мас з боку паасобных проф. і парторганаў“.

Комсамолія, юнкоры, „ЛК“! Усебеларускі рэйд падыходзіць да канца. Вы павінны за гэты вельмі кароткі тэрмін праверыць становішча з рэагаваньнем на рабселькораўскія заметкі ў тых організацыях, дзе вы знаходзіцеся. Выявіць усіх опортуністых, якія сваёй цяганінай душаць крытыку.

„Чырвоная Зьмена“ чакае вашых допісаў.

Выкрыць і пакараць опортуністых

Пры вучоце об'ектаў абкладаньня па Лагойскім раёне быў дапушчаны шэраг права-опортуністычных дзеяў, аб чым сьведчыць той факт што ў раёне выяўлен толькі... адзін кулак.

Зірнуўшы глыбей у гэтую справу, убачым людзей, якія прытрымліваюцца тэорыі і практыкі „ўрастаньня кулака ў соцыялізм“, якія прымазаліся ў нашыя раённыя ўстановы. Вось яны:

ФАЙН І.—былы казённы рабін, уладаў усім Лагойскам, а зараз працуе ў інвалідмай арцелі.

КАГАН Ш.—былы буйны гандляр быдлам, зараз працуе ў Жывсаюзе.

ГОРШМАН Ш.—зараз знаходзіцца разам з сям'ёю ў колгасе „Бальшавік“. Да рэволюцыі гандляваў збожжам, садамі і меў краму. Пасьля рэволюцыі адчыніў маслабойны завод, эксплёатуе рабочых, скупляе збожжа. У 1927 годзе ў Горшмана знаходзяць кантрабанду. Да 1930 году ён быў пазбаўлен выбарчых правоў. Як-жа гэта зараз папаў ён у колгас?

ПАЛЬЧЭЎСКІ ФЛЁР—актывіст-колгасьнік, праўленьнем выключан з колгасу за тое, што сказаў: **„Горшману ня месца ў колгасе, як клясава-чужому элемэнту“.** Дзякуючы напору мас, праўленьне было прымушана Пальчэўскага ізноў прыняць у колгас. Але Горшман—усё-ж колгасьнік.

Крытыкі тут ня існуе. Крытыка не зьўляецца зброяй барацьбы з недахопамі, тут баяцца крытыкі, яе заганяюць у гроб.

Райкому партыі, райкому комсамолу неабходна зацікавіцца гэтай справай. Выявіць опортуністых, якія баяцца клясавай барацьбы і пакараць іх.

„Лёгкі Кавалерысты“.

Галярэя ельскіх чужакоў

У Райміліцыі працуе сьледчы Равгапула,—да рэволюцыйнага часу патомсьцьвены дваранін. Мае сувязь з папом і часта „гутарыць“ з папом аб сучасным жыцьці.

У РВК працуе Майкаў,—бюрократ, п'яніца, які ўцёк ад чысткі, а пасьля чысткі ізноў працуе ў фінчастцы на падзённай працы. У РВК кажуць:—Гэтага Майкава няма кім замяніць.

У Лесбеле працуе Жарабцоў, які ў свой час таксама быў вычышчаны з сав. апарату. „Праца“ яго заключаецца ў тым, што ён займаецца крытыкай савецкага ладу, вялікадзяржаўна-шовіністычнымі заўвагамі да беларускае мовы, абвінавачваньнем „лёгкай кавалерыі“ ў тым, што яна не праварае працу, не зьўляецца рабоча-масавым кантролем, а вядзе плёткі і што яе трэба гнаць.

Гэты „букецік“ чужых трэба вымесьці з наседжаных месц.

„Лёгкая кавалерыя“.

Нам такія „кіраўнікі“ не патрэбны

Бягомельскі атрад „ЛК“ беспрабудна сьпіць на чале з сваім кіраўніком Вярбіцкім. Атрад ня прыняў ніякага ўдзелу ў часе ходу кампаніі вучоту аб'екту абкладаньня, хлеба і бульбазагатовак і ўсеагульнага навучаньня. Ячэйка ЛКСМ таксама нічога ня робіць і працы ад атрату „ЛК“ не патрабуе.

Мы патрабуем ад Бягомельскага РК ЛКСМБ тэрмінова прыцягнуць да комсамольскай адказнасьці кіраўніка атраду Вярбіцкага, якому, мы лічым, ня месца ў шэрагах БСМ за бязьдзейнасьць у працы „ЛК“.

„Кавалерыст“.

Нядбайныя адносіны да працы

Садова-гародныя продукты Капыльскі райколгассаюз здае садова-гароднай частцы МЦРК, магазыну № 6. Мы ня будзем тут гаварыць аб надзвычайна недапушчальных, бюрократычных адносінах працаўнікоў 6-га магазыну да правадпікоў продуктаў.

Пра цьвёрдыя цэны на продукты садова-гародная частка нічога ня ведае. За гэта гаворыць той факт, што адзін раз плоціцца за тону гуркоў 172 руб. 40 кап., другі раз 68 руб. 90 кап., трэці раз—86 руб. 20 кап., а чацьверты—200 руб. за тону і г. д. А гуркі ўсе аднаго гатунку.

Недапушчальна нядбайна адносяцца да квіткоў. У Райколгассаюзе няма ніводнага квітка, з якога было-б ясна відаць, што атрымана, кім колькі заплачана. У квітках галавацяпскія лічбы. Напрыклад, у квітку № 3082 ад 20-га жніўня ніяк нельга зразумець, ці там напісана 3562, ці 352, хаця чатырох і трохзначныя чысла можна хутка разабраць.

Райколгассаюз запісаў большую лічбу, бо за гэты магазын выплачвае банк па райколгасаўскіх рахунках.

У квітку ад 20-га жніўня стандартны нумар—104 чамусьці выпраўлены звычайным алоўкам на № 21. Між іншым, на гэтым квітку лічыцца тавару на 924 рублі 73 кап.

Грашовыя сумы выстаўляюцца неразборліва, лічбы ня маюць прапісу.

Яшчэ адно характэрнае галавацяпства ў садова-гародным магазыне № 6. У квітках амаль не ўпамінаецца, якім колгассаюзам здаецца тавар.

Мы ня ведаем, як гэта расцэньвае садова-гародная частка МЦРК, але лічым гэта больш чым галавацяпствам.

Брыгадзір „Ч. З.“ Варанецкі.

Ударыць па руках заціскачоў самакрытыкі

Група „ЛК“ пры Гомельскай школе ФЗВ (завод імя Ланцуцкага) распалася ў канцы навучальнага 29-30 г., а зараз бюро ячэйкі ФЗВ не організуе групы „ЛК“ з-за боязьні крытыкі групы „ЛК“ бязьдзейнасьці бюро ячэйкі. А крытыкаваць бюро ячэйкі ёсьць за што, бо на працягу ходу ўсіх важнейшых гаспадарча-політычных кампаній нічога ня зроблена. Бюро колектыву і Гомельскі гарком КСМ павінны выкрыць заціскачоў самакрытыкі і каго патрэбна прыцягнуць да адказнасьці.

О.

„Вон з майго кабінэту!“

25-га верасьня групай „Л. К.“ быў зроблен „налёт“ на Парыцкі РВК, дзе выяўлена шмат недахопаў. Супрацоўнікі касы часта кідаюць работу і ня бываюць па 2 гадзіны. Сяляне ня могуць здаць падатку, бо каса зачынена. У час „налёту“ 10 сялян прыносілі падатак і не маглі яго здаць.

Бухгальтар касы РВК т. Скібскі бюрократычна адносіцца да наведвальнікаў.

Вывешаная для асьвятленьня ходу пазыкі „5-годка—у чатыры гады“ дошка вісіць пустая.

Працаўнікі зьяўляюцца на працу на гадзіну пазьней чымся гэта патрэбна.

Аграномічная і зямельная часткі большасьць часу бываюць зачынены.

Старшыня РВК т. Дашко замыкаецца ў сваім габінэце ад наведвальнікаў.

Калі „кавалерыстыя“, выявіўшы ўсе гэтыя недахопы, склалі акт і накіраваліся да старшыні РВК—тав. Дашко каб ён гэты акт падпісаў, той накінуўся на „кавалерыстых“:

— Мяшчане! Лодыры! Вон з майго габінэту! Вы перашкаджаеце працаваць!

Сваю „прамову“ Дашко ўпрыгожыў некалькімі матамі.

Мы протэстуем супроць такіх адносін да „Л. К.“ з боку адказных працаўнікоў! патрабуем за ігнараваньне „Л. К.“ прыцягнуць т. Дашко да адказнасьці.

Юнкор Хвёдар К. К.



Старшыня Парыцкага РВК т. Дашко аказаўся бюракратам

У некалькі радкоў

У сакавіку г. г. Нараўлянская спажывецкая кооперацыя адчыніла двухмесячныя курсы кооператараў. На гэтых курсах вучылася 40 чалавек. Але, нажаль, скончыўшыя гэтыя курсы зараз пасуць жывёлу, а некаторыя ходзяць без працы.

Хто пусьціў грошы на вецер?

Шупшын.

* *

У в. Бібачкі, Любаньскага раёну, ёсьць настаўніца Дубовік Матруна, якая б'е вучняў, цягае за валасы, адбірае кнігі. Адзін раз на „дзяды“ (рэлігійнае сьвята) вучні спазьніліся, дык яна зачыніла школу і сказала:—„Праўце дзяды“.

Дубовік абзывае вучняў бандытамі, хуліганамі, сьвіньнямі, быдлам, злодзеямі.

Хто ўціхамірыць „запал“ настаўніцы Матруны Дубовік?

Аўтар.

* *

У Віцебскім фабзавучы на ільняным аддзяленьні працуе і вучыцца грамадзянка Працаповіч Ганна. Бацька яе—былы стражнік, пазбаўлен выбарчых правоў. У фабзавуч Працаповіч Ганна паступіла пад чужым прозьвішчам Гуоўрэвіч Ганна.

Ня месца такім у шэрагах ФЗВ.

БП і В. Г. Н

Дзе групы „ЛК“ і райштаб?

У Пухавіцкім раёне ёсьць шэраг хваравітых зьявішч, а групы „Лёгкай Кавалерыі“ сьпяць. Амаль ня было ніводнага „налёту“ аб ходзе сілосаваньня, пабудовы сьвінарнікаў у колгасах. Ня выявілі злачынцаў зрываючых гэтую справу. Райштаб „ЛК“ ня кіруе. Райкомы КП(б)Б і ЛКСМБ аб гэтым становішчы добра ведаюць, але не зьвяртаюць ніякай увагі. Пухавіцкая РСІ—твой абавязак ускалыхнуць бязьдзейнасьць райштаба „ЛК“ і зрабіць групы „лёгкіх кавалерыстых“ баявым ударным дапаможнікам у працы.

Міфа.

ПА „КАВАЛЕРЫСКІХ“ УХАБАХ

Ігноруюць працу „Лёгкай Кавалерыі“

„Налётам“ на крэдытнае таварыства Прапойскага р-ну выяўлена вялікая запавычанасьць нэпманаў і кулакоў. Батрацтва крэдытамі не забясьпечваецца.

„Налётам“ на ЦРК выяўлена, што з-за дрэннага прыгляду папсавалася **2 пуды мяса.** Былі выпадкі, калі бралі больш пай, чым трэба.

„Налётам“ на сямігодку выяўлена таксама шмат недахопаў. **Усе выяўленыя недахопы маюць месца і зараз таму, што працу „Л. К.“ ігноруюць.**

Напр., **Канцавы** зазываў у габінэт прыказчыкаў лавак і прымушаў іх пісаць залвы на „лёгкіх кавалерыстых“, быццам „кавалерыстыя“ адміністравалі.

Неабходна пакласьці канец ігнараваньню працы „Л. К.“.

Кірэеў.

* * *

Група „Л. К.“ пры ячэйцы ЛКСМБ колгасу „Х-годзьдзе БССР“ **Магілеўскага раёну** сьпіць моцным сном. За ўвесь час свайго існаваньня група не зрабіла ніводнага наскоку на выяўленьне бюрократызму, які маецца, напрыклад, у канторы колгасу. Ці ня час ужо прачнуцца?

Юнкор Грышанаў.

* * *

У Клічаўскім р-не комсамольскія ячэйкі на павярнуліся як належыць тварам да вытворчасьці, комсамольцаў, як добрых працаўнікоў, не адзначаецца на працы.

У раённых установах ёсьць шмат фактаў бюрократызму і валакіты, а „лёгкая кавалерыя“, разам з кіраўніком райштабу Ганчарэнка, бязьдзейнічае.

Райком комсамолу і Райштаб таксама нічога не прадпрымаюць.

Пяро.

Імпэрыялістыя скалачваюць антысавецкі фронт

Устанаўляюць асобы кантроль для тавараў СССР

ПАРЫЖ, 22. Агэнцтва „Гавас" паведамляе:

„Міністэрства бюджэту апублікавала наступнае паведамленьне: „з мэтай забясьпечыць ажыцьцяўленьне дэкрэту аб кантролі над імпортам, які ідзе з СССР, наступныя тавары павінны суправаджацца сэртыфікатамі аб паходжаньні: жывая ... штушка бітая (у тым ліку і ...), збожжа і вытворчыя вырабы, цукер, патака, звычайны лес, за выключэньнем смалістага, прызначанага для вытворчасьці папяровай масы, клей, жалацін, алеін, гэолін, алеінавы квас і стэарынавы квас.

Усе з гэтых продуктаў, якія выходзяць з СССР, не маюць патрэбы ў сэртыфікатах, а падпарадкаваны правілу, якія патрабуецца папярэдні дазвол.

Усе гэтыя мерапрыемствы ўступаюць у сілу з 25-га лістапада".

Двудушная заява Фляндэна

ВЕНА.—Як паведамляюць з Бухарэсту, выехаўшы 20-га кастрычніка ў Софію францускі міністр гандлю Фляндэн, які організуе паход супроць савецкага экспорту, заявіў представіком румынскага друку, што ён парашыў, з свайго боку, перайсьці да сыстэмы кантролю над савецкім увозам, дзеля чаго і ўведзены „асобныя ўвозныя дазволы".

„Аднак,—кажа Фляндэн,—ажыцьцявіць меры супроць савецкага ўвозу ў эўропэйскім маштабе цяжка. Агульны крыжовы паход супроць савецкіх тавараў захопіць шэраг інтарэсаў, пры чым цяжка ўлічыць, ці будзе ён мець посьпех".

Бягучыя справы

Слухалі: Пастанавілі:

Зводка з антысавецкага фронту

* Як паведамляюць з Софіі баўгарская буржуазная прэса, на прыкладу друку буйных імпэрыялістычных краін, іззоў узмацніла антысавецкую кампанію, імкнучыся выкарыстаць модную цяпер лягенду аб „савецкім дэмпінгу". Даючы адпор гэтай кампаніі хлусьні і паклёпу, сакратар рабочай партыі (рэволюцыйная) Петко Напетаў апублікаваў у рабочай газэце „Рэха" сэрыю артыкулаў, якія малююць сапраўднае становішча ў СССР. Прыводзячы шматлікія факты і лічбы, Напетаў абвергнуў выдумкі фашысцкай прэсы.

* Румынская капіталістычная прэса ўзмацняе сваю кампанію супроць Савецкага Саюзу, выкарыстоўваючы з гэтай мэтай лягенду аб „савецкім дэмпінгу". Экономічны орган „Аргус" у перадавым артыкуле, напісаным генэральным дырэктарам Аграрнага банку—Радукану, рашуча патрабуе інтэрвэнцыі супроць СССР. Радукану заклікае да экономічнай блёкады СССР: „Нельга больш паволіць, неабходна перайсьці ад слоў да справы".

* ВЭЙПІН.—Як паведамляюць з Харбіну, японская прэса ў Манчжурыі пачала кампанію супроць „савецкага дэмпінгу". Асабліва стараецца орган ангельскіх цьвёрдалобых у Цзянь-Цьзіно „Пэкін энд Цяньцзін Таймс".

* ЛЁНДАН.—У адказ на пастанову савецкага ўраду аб рэпрэсіях у адносінах краін, якія перашкаджаюць савецкаму экспарту, „Таймс" навёў ярасную атаку на монополію замежнага гандлю СССР. Газэта ня скрывае, што галоўны сэнс кампаніі супроць „савецкага дэмпінгу" зводзіцца да барацьбы супроць савецкай монополіі замежнага гандлю.

* АНГОРА. Па паведамленьнях Анаталійскага тэлеграфнага агэнцтва, францускі міністар гандлю Фляндэн прыбыў 21-га кастрычніка ў Стамбул з Румыніі. Заўтра Фляндэн выедзе ў Ангору.

* ПАРЫЖ.—Як паведамляюць з Бруселю, савет міністраў Бэльгіі пастанавіў прадставіць на подпіс караля дэкрэт супроць савецкага экспорту. Дэкрэт абумоўлівае спэцыяльнымі дазволамі міністэрства земляробства, прамысловасьці, альбо працы імпорт, а таксама транзыт некаторых тавараў, якія вырабляюцца, альбо якія прыбываюць з Савецкага Саюзу.

У разьбітага карыта

СНК СССР пастанавіў зусім спыніць, альбо максымальна скараціць заказы і закупкі у краінах, якія вядуць барацьбу з савецкім экспортам. (З газэт).



Сусьветны экономічны крызіс і рабочая моладзь*)

Рабочы дзень моладзі павялічваецца нараўне з рабочым днём дарослых. Уласна кажучы, ніякай розьніцы паміж рабочым днём дарослага і падлетка няма, калі ня лічыць, што вучань-падлетак павінен яшчэ пасьля работы заставацца для чысткі машын і ўборкі памяшканьня. Не гаворачы ўжо аб Кітаі і калёніях, дзе рабочы дзень падлетка ўзрос да 14 гадзін, нават у „культурнай" і высока тэхнічна разьвітай Нямеччыне большасьць рабочае моладзі працуе 9-10 і 11 гадзін. Калі да гэтага дадаць штрафы, вылікі і даплату майстром за абучэньне, дык малюнак нявыносных умоў, у якіх знаходзіцца моладзь, стане ясным.

Нястрымная капіталістычная эксплёатацыя парадзкае сярод моладзі масавае нездавальненьне, пераходзячае ў забастоўкі, стачкі і дэмонстрацыі. Процэсы палявеньня і рэволюцыянізаваньня ў асяродку моладзі адбываюцца куды хутчэй, чым сярод дарослых рабочых.

За апошнія паўтара—два гады па ўсіх краінах моладзь ня толькі ўзмацніла свой удзел і актыўнасьць у агульных рабочых стачках, але і дамаль паўсюды праводзіць самастойныя стачкі, якія носяць ня толькі абарончы, але і наступальны характар.

Буржуазія надзвычайна добра ўлічвае ролю і сілу моладзі ў клясавай барацьбе. З аднаго боку, буржуазія стараецца падкупіць моладзь праз спэцыяльна організуемыя клюбы, пляцоўкі, гурткі і іншыя організацыі. З другога боку, яна імкнецца цэлай сеткай новых законаў задушыць рэволюцыйную барацьбу моладзі. Фашысцкі закон аб заводзкай апецы, аб „моралі", (па якому моладзі забараняецца прымаць удзел у стачках), і адкрытыя разгоны рэволюцыйных маладзёжных організацый проста накіраваны супроць растучага палявеньня самых шырокіх мас працоўнай моладзі. Ад паноў не адстаюць і іх лёкаі. Соцыял-фашысцкі саюз моладзі і сялянскі фашысцкі саюз паказалі сябе выключна, як пастаўшчыкі штрэйкбрэхераў, зрываючых барацьбу маладых пролетарыяў.

Адзінымі сапраўднымі абаронцамі экономічных і політычных інтарэсаў моладзі зьяўляецца толькі комсамол і рэволюцыйныя профсаюзы. Яны павінны на базе правільнага прыстасаваньня тактыкі адзінага фронту зьнізу і барацьбы за частковыя патрабаваньні рабочае моладзі павесьці за сабой усю рабочую моладзь, якая знаходзіцца яшчэ ў значнай меры ва ўладзе дэмагогічнай фразэолёгіі фашыстых і пад уплывам соцыял-фашысцкіх тэорый „аб немагчымасьці праводзеньня стачак у пэрыод крызісу".

Неабходна выкрываць з кожным днём на кожным прыкладзе клясавае значэньне соцыял-фашысцкай і фашысцкай дэмагогіі, выкрываючы гнюсную і здрадніцкую ролю гэтых агэнтаў буржуазіі. Неабходна ўпарта падрыхтоўваць нават самыя дробныя забастоўкі, змагацца за штодзённыя патрабаваньні рабочае моладзі, увязваючы іх з канечнымі мэтамі і барацьбой за політычную ўладу і на гэтай аснове заваяваць большасьць моладзі.

Пад выпрабаваным кіраўніцтвам Комінтэрну і КІМ'у комсамол усяго сьвету гэтыя задачы выканае і даб'ецца перамогі.

П. Рахомягі.

*) Канец. Пачатак гл. № 247.

Паведамленьні

26 кастрычніка, роўна а 6 гадзіне ўвечары, адбудуцца справаздачныя куставыя сходы ячэек ЛКСМБ Фрунзэўскага раёну ў наступных клюбах:

1. Клюб друкароў—ячэйкі: друкарні Сталіна, металістых, шорнай ф-кі, друкароў саюзная, шпалернай фабрыкі, ф-к Уціль, Эльводу, тэкстыльнай ф-кі, працасьветы, рэдакцыі газэт, ВСНГБ, НДІ, 2-хгадовых пэдкурсаў, Белпэдтэхнікуму, Музтэхнікуму, горных курсаў, зав. дрэваапрацоўшчык, друкарні „Зьвязды".

2. Клюб гарсавету—ячэйкі: „Комунара", Яўпэдтэхнікуму, скарняжнай, „Беларускі", Аўтатранспарту, ФЗВ, Швейнікаў, ф-кі „8-е сакавіка", Політэхнікуму, Курасоўшчыны, Профшколы, краўцоў, ф-кі „Акцябр", Нарсувязі, Белдзяржкіно, Дзяржплану.

3. Клюб савгандльслужачых—ячэйкі: Белдзяржбуду, „Комунаркі", 2 харч. заводаў, Нархарч сталовых, групкому харчавікоў, міліцыі, Наркамгандлю, комгасу, Хлебзаводу, мэдсанпрацы, Абкомтрэсту, ВЗО, Аўтатэхнікуму, Польпэдтэхнікуму, усе саўгаскія ячэйкі.

4. Клюб будаўнікоў—ячэйкі: Менбудтрэсту, будаўнікоў, профшколы будаўнікоў, Белжылсаюзу, усіх цагельных заводаў.

25 кастрычніка а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні ФРК ЛКСМБ склікаецца пасяджэньне ФРБ ДКО пытаньню:

1. Удзел піонэраў у культэстафеце комсамолу.

2. Удзел піонэраў у вытворчых паходах.

На пасяджэньне выклікаюцца сакратары РБ, усе важатыя баз і фарпостаў.

ФРБ ДКО

29-X—30 г., а 6-й гадзіне ўвечары адбудзецца пасяджэньне ЦКК, на якое выклікаюцца наступныя т. т.: Івашчанка, Сімкін, Серафімовіч, Крашэін, Арцімовіч, Філончык В., Кі... Н., Нікалаевіч П. С., Шыркевіч, Верацэнка. Кукін, Пучкаёў Я. Хаданові Д., Шаройкін, Дзер... Кольчаў В., Пісарэвіч М. П., Кац... сон С., Ліповіч Р., Фамін, В... раўскі, Караткевіч С. В., Кушнер С., Шыдлоўскі Н. В., Міхальскі В., Смаралінскі Я. А., Іофэ, Рэлін, Малахоўскі, Ангайбэр Ц., Рынкоў і Жоўцік С. А.

Праезд за свой кошт.

ЦКК ЛКСМБ

Адказны рэдактар ...
Рэдколегія

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 500